

БУДОЎЛЯ ПА ДАВЕРЫ 3



КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў ПАДЛЕТКАЎ 7



19 ЛЮТАГА 2020 г.

СЕРАДА

№ 33 (29147)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


## ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ АФРЫКА

**Прэзідэнт Беларусі 19—20 лютага наведвае Егіпет з афіцыйным візітам.**

У Каіры Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Егіпта Абдэль Фатахам аль-Сісі. Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць рэалізацыю бягучых дамоўленасцяў, дасягнутых падчас візіту егіпецкага лідара ў Мінск летам мінулага года, перспектывы развіцця гандлёва-эканамічных і гуманітарных адносін. Прэзідэнты разгледзяць пытанні ўзаемадзеяння на міжнародных пляцоўках, забеспячэння бяспекі ў рэгіёне і свеце ў цэлым. Па выніках перагавораў чакаецца падпісанне пакета двухбаковых дакументаў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

У Аляксандра Лукашэнкі таксама запланаваны шэраг сустрэч і наведванне сумесна з Абдэль Фатахам аль-Сісі Новай адміністрацыйнай сталіцы Егіпта, якая будуецца ў 45 кіламетрах на ўсход ад Каіра.

Паралельна візіту кіраўніка дзяржавы ў Каіры пройдзе пасяджэнне Беларуска-Егіпецкага савета дзелавога супрацоўніцтва.

Гэта трэці афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Егіпет. Першыя два адбыліся ў 1998 і 2017 гадах. Летась Прэзідэнт Егіпта ўпершыню наведаў з афіцыйным візітам Беларусь. Па выніках перагавораў у Мінску краіны дамовіліся выводзіць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва на больш высокі, якасны і выніковы ўзровень.

«Паміж нашымі дзяржавамі няма абсалютна ніякіх праблемных пытанняў. Няма закрытых тэм для абмеркавання. Важна, што мы актыўна перайшлі да трансфармацыі дружалюбных палітычных адносін у шматпланавае і выгаднае эканамічнае супрацоўніцтва. І сёння ўжо ёсць адчувальны вынік і сур'ёзны прагрэс у гэтым накірунку», — сказаў тады Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь і Егіпет падпісалі комплексную праграму (дарожную карту) развіцця супрацоўніцтва на 2019—2020 гады. Бакі дамовіліся пашыраць супрацоўніцтва ў такіх перспектыўных сферах, як інфармацыйна-камунікацыйныя напрамкі развіцця, аэракасмічныя і авіяцыйныя тэхналогіі, нанаматэрыялы, малекулярная генетыка, металазнаўства, фармацэўтыка, оптыка. Плануецца таксама актывізаваць узаемадзеянне ў сферы адукацыі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## СВІСЛАЦКІЯ «ЛЕДАКОЛЫ»




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лёд на Свіслачы хоць месцамі вельмі тонкі, але ёсць. Зрэшты, байдарачнаму «каравану», які прабіраецца праз замерзлую плынь на рацэ паміж сталічнымі Траецкім прадмесцем і праспектам Пераможцаў, ён зусім не перашкода.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід КАСІНСКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны:**

*«Указам кіраўніка дзяржавы аб прызыве на тэрміновую ваенную службу і аб звальненні з тэрміновай ваеннай службы ў запас замацаваны досыць значныя прэферэнцыі. У першую чаргу, гэта ўлік працягласці тэрміновай службы ў страхавы працоўны стаж. Другая мера — гэта замацаванне права за вайскоўцамі, якія выконваюць свой воінскі абавязак (і за членамі іх сем'яў), на тыя інтэрнаты, якімі яны былі забяспечаныя ў адпаведнасці з працоўнымі дагаворамі перад прызывам на тэрміновую службу. Таксама ўказам замацавана права ваеннаслужачых па заканчэнні службы на бясплатнае навучанне на факультэтах даўніверсітэцкай адукацыі і падрыхтоўкі пры паступленні і падрыхтоўцы да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, прычым не толькі ваенныя, але і агульнаграмадзянскія».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «ХАЦЕЛАСЯ Б ПОЎНАЙ ЯСНАСЦІ»

### Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком «Раснафты»

**З Ігарам Сечыным, галоўным выканаўчым дырэктарам расійскай кампаніі, кіраўнік краіны абмеркаваў нафтавыя пытанні.**

«Хаваць няма чаго. Хацеў бы абмеркаваць з кіраўніком найбуйнейшай нафтаздабываючай кампаніі, публічнай кампаніі, сітуацыю, якая складваецца ў нашых узаемаадносінах, можна сказаць, Беларусі і Расіі, па нафце», — сказаў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што з Ігарам Сечыным хоча параіцца, як дзейнічаць далей і працаваць у тым ліку і з «Раснафтай». У мінулым годзе кампанія паставіла ў Беларусь палову «чорнага золата», якое наша дзяржава купляла ў Расіі і перапрацоўвала на айчынных НПЗ.

«Хацелася б поўнай яснасці. Карыстаючыся тым, што мы даўно ведаем адзін аднаго, вы і падкажаце нешта, і мы зможам дамовіцца аб далейшым нашым супрацоўніцтве», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ігар Сечын падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за запрашэнне і магчымасць абмеркаваць з ім актуальную тэму.

«Я вельмі цаню тыя даверлівыя адносіны, якія існуюць паміж намі. І хацеў бы сказаць, што «Раснафта» з'яўляецца адным з буйных інвестараў у эканоміку Беларусі, і мы з'яўляемся ўдзельнікамі акцыянернага капіталу Мазырскага НПЗ, — канстатаваў Ігар Сечын. — І адказваючы на ваша пытанне, што рабіць далей, Аляксандр Рыгоравіч, — трэба працаваць разам. Канешне ж, мы настроены канструктыўна».

**Марыя ДАДАЛКА.**

**Даведка**

«Раснафта» — найбуйнейшая нафтагазавая карпарацыя свету. Па інфармацыі, размешчанай на афіцыйным сайце кампаніі, у 2019 годзе ўзровень здабычы вуглевадародаў склаў больш за 285 мільёнаў тон нафтавага эквіваленту, пры сярэднесутачным узроўні здабычы каля 5,8 мільёна бараляў. Гэты вынік адзін з найлепшых у глабальнай галіне. Аб'ём перапрацоўкі нафты і газавага кандэнсату за мінулы год — 110 мільёнаў тон. З іх 10 мільёнаў — на нафтаперапрацоўчых заводах кампаніі за мяжой. Кампанія валодае сеткай запраўак на тэрыторыі Беларусі, якая складаецца з 36 АЗС.

Размова па сутнасці

## МОВА АНЛАЙН

### Ці дапамагаюць нам новыя інфармацыйныя тэхналогіі гаварыць і пісаць па-беларуску?

**Паводле чаго вызначаецца жыццядзейнасць і жыццяздольнасць той ці іншай мовы? Яшчэ гадоў пятнаццаць таму асноўнымі крытэрыямі лічылася колькасць вучняў, якія атрымліваюць на ёй адукацыю або вывучаюць яе, наяўнасць кнігавыдання, прысутнасць мовы ў дзяржаўных інстытуцыях... Сёння ўсё гэта таксама, безумоўна важна, але новыя тэхналогіі і тут дыктуюць свае правілы: пра тое, наколькі мова жывая, мяркуюць у першую чаргу па яе прысутнасці ў віртуальнай прасторы — у камп'ютарным забеспячэнні, у рознага кшталту дадатках, у сацыяльных сетках, увогуле ў Сеціве...**

**Хтосьці тут жа, прыгадаўшы беларускую раскладку клавіятуры, у тым ліку і для мабільных прылад, беларускамоўную «Вікіпедыю», «Вайбер» ды «Фэйсбук», якія будуць камунікаваць з карыстальнікам па-беларуску, было б толькі яго жаданне, скажа, што ў гэтым плане з нашай мовай усё ў парадку. Але ці так гэта насамрэч? У грамадстве, дзе большасць носьбітаў менавіта жывой мовы дажываюць век у вёсках ці пасяліліся на кніжных старонках у творах класікаў, а моладзь толькі пачынае мовай цікавіцца, ці не прыйдзем мы ўрэшце да мовы перакладчыка Google — і яна будзе лічыцца эталонам?**

**Пра гэта і пра іншыя рызыкі і праблемы, а таксама пра станоўчыя моманты ва ўплыве інфармацыйных тэхналогій на развіццё беларускай мовы вялася гутарка падчас круглага стала ў рэдакцыі «Звязды».**

СТАР. 6




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Беларусь памятае

## ЭСТАФЕТА ІДЗЕ ДАЛЕЙ...

**Учора каля Кургана «Дружбы» на стыку межаў Беларусі (Верхнядзвінскі раён), Латвіі і Расіі адбылася ўрачыстая цырымонія перадачы «Эстафеты Перамогі» ўздоўж знешніх межаў дзяржаў-удзельніц СНД. Акцыя прысвечана 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**



Фота БелТА.

Эстафета перададзена беларускімі пагранічнікамі іх калегам з Расійскай Федэрацыі.

Падчас заключнага этапу патрыятычнага марафону на беларускай зямлі ў памежжы былі арганізаваныя ўрачыстыя сходы, мітынгі і ўрокі мужнасці.

Ва ўрачыстым мерапрыемстве, прымеркаваным да перадачы эстафеты, узялі ўдзел кіраўніцтва Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, прадстаўнікі Каардынацыйнай службы Савета камандуючых пагранічнымі войскамі краін СНД і прадстаўнікі пагранічнай службы ФСБ Расіі, кіраўніцтва мясцовай улады, члены ветэранскіх і маладзёжных арганізацый, прадстаўнікі духавенства.

Каля чатырох тысяч кіламетраў у Беларусі — такі доўгі шлях у эстафеты, якая пабывала на кожнай пагранічнай заставе. Літаральна ўся мяжа стала месцам правядзення гэтай акцыі. Адбылося шмат розных сустрэч ветэранаў пагранічнай службы з пагранічнікамі, кадэтамі, вясковымі жыхарамі. Моладзь праявіла вялікую цікавасць да мерапрыемстваў. Хлопцы і дзяўчаты ўважліва слухалі расказы пра подзвігі пагранічнікаў падчас вайны, пра будні службы ў наш час.

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Албанія атрымае больш за €1 млрд для аднаўлення пасля землятрусу



Удзельнікі міжнароднай донарскай канферэнцыі ў Брусэлі сабралі больш за €1 млрд дапамогі Албаніі для пераадолення наступстваў землятрусу, які адбыўся ў краіне ў лістападзе мінулага года. Пра гэта паведаміла кіраўнік Еўракамісіі (ЕК) Урсула фон дэр Ляен. «Добрыя навіны для народа Албаніі — мы перавысілі наш мэтавы паказчык для аднаўлення Албаніі і дасягнулі €1,15 млрд, у тым ліку ўнёсак Еўрасаюза склаў €400 млн», — сказала яна.

У міжнароднай донарскай канферэнцыі для Албаніі ўзялі ўдзел краіны — члены ЕС, дзяржавы Заходніх Балкан, а таксама міжнародныя арганізацыі, у тым ліку ААН і Сусветны банк.

### У Парагваі абвясцілі надзвычайны рэжым з-за ліхаманкі дэнге

Ніжняя палата парламента Парагвая зацвердзіла законапраект аб увядзенні рэжыму надзвычайнай сітуацыі з-за распаўсюджання ліхаманкі дэнге на тэрыторыі краіны. Пра гэта гаворыцца ў апублікаваным паведамленні Палаты дэпутатаў. «Тэрмін дзеяння — 90 дзён», — адзначаецца ў дакуменце. Мера дазволіць накіроўваць з бюджэту краіны больш сродкаў на барацьбу з захворваннем. Раней аналагічнае рашэнне прыняла Палата сенатараў (верхняя палата парламента). У канцы студзеня ўлады сталіцы краіны Асунсьон абвясцілі ў горадзе рэжым надзвычайнай сітуацыі для барацьбы з распаўсюджаннем ліхаманкі дэнге. Мера прадугледжвае, у прыватнасці, фумігацыю памяшканняў. Як вядома, дэнге — вірусная інфекцыя, якая пераважае ў трапічных і субтрапічных рэгіёнах.



### У Сікстынскую капэлу вярнулі габелены Рафаэля



Упершыню за 500 гадоў у Сікстынскай капэле ў Ватыкане вывесілі разам усе 12 габеленаў, выкананых па эскізах Рафаэля Санці, перадае Reuters. Упершыню яны былі вывешаны да дня Святога Стэфана 26 снежня 1519-га. Праз некалькі месяцаў Рафаэль памёр, так і не пабачыўшы серыю твораў скончанай, адзначае ТАСС. Габелены, кожны з якіх важыць 50-60 кілаграмаў, выкананы з залатых і шаўковых нітак і адлюстроўваюць біблейскія эпізоды з жыцця апосталаў Пятра і Паўла. Выстаўка прымеркавана да 500-годдзя з дня смерці мастака і будзе доўжыцца ўсяго тыдзень. Пазней габелены вернуцца ў музеі.

ISSN 1990 - 763X

## КОРАТКА

- **Сёлета ў Беларусі плануецца пабудаваць 135 тысяч кв. м жылля, якое будзе ацяпляцца электрычнасцю.**
- «Белпошта» прапануе бясплатна адправіць паштоўку да 23 лютага.
- **«Луч» выпусціў гадзіннікі з вершам Максіма Багдановіча.**
- Банк развіцця Беларусі ў 2020-м можа выпусціць еўрабонды ў нацвалюце на Br200 млн.
- **Караеў: нарказлачынстваў стала менш, але колькасць канфіскаваных рэчываў вырасла.**
- Палявыя жаваранкі і кулікі прыляцелі ў Беларусь.



- **Тыдзень роднай мовы пройдзе ў БДУ з 21 па 27 лютага.**
- «Белпошта» прыпыніла прыём паштовых адпраўленняў з Кітая.

Сацыяльны бізнес

## Праект, які натхняе

### Прадпрымальнікі запусцілі сацыяльную ініцыятыву, каб сэканоміць сродкі бюджэту, але вымушаны за гэта плаціць

**Ці ведалі вы, колькі сродкаў бюджэту (лічыце, нашых сродкаў) траціцца, каб ачысціць пад'езды, слупы ды прыпынкі на вуліцах ад празмернай і не заўсёды карыснай рэкламы? Прадпрымальнікі з Беразіно Дзмітрый і Святлана ЛАБКОВІЧЫ знайшлі спосаб зрабіць гэтую рэкламу цывілізаванай і стварылі сацыяльны праект, каб сэканоміць нашы сродкі. Але ўсё аказалася не так проста...**

### З ЛІФТА — НА ВУЛІЦУ

Пяць гадоў таму Лабковічы, мабыць, як і любая маладая сям'я, пачалі шукаць дадатковую крыніцу даходу. Святлана пакінула сваю работу ў школе, а ўвагу Дзмітрыя, які на той момант яшчэ працаваў у МНС, прыцягнула рэклама ў ліфтах.

— Рэклама для мяне ў першую чаргу была творчасцю і заўсёды цікавіла як сфера дзейнасці, таму я адразу звярнуў увагу на камерцыйныя аб'явы ў ліфтах дамоў Мінска. Аднак у Беразіно пераважае малапавярховая забудова, і мы пачалі думаць, як можна зрабіць рэкламу цывілізаванай менавіта ў маленькіх гарадах, — кажа Дзмітрый Лабковіч. — Амаль адразу мы зразумелі, што можна не толькі зарабляць на гэтым грошы, але і рабіць нешта добрае для людзей, каб рэклама перастала іх раздражняць і стала якасным прадуктам. І вельмі хутка наш камерцыйны праект ператварыўся ў сацыяльна-рэкламны.

СТАР. 3

